# АНДРЫЁЛІ МІХАЛ ЭЛЬВІРА



Жывапісец, рысавальшчык, ілюстратар, удзельнік паўстання 1863-64 гг. у Літве і на Беларусі. Нарадзіўся 2 лістапада 1836 года ў Вільні. З сям'і скульптара, выхадца з Італіі. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства (1855-57), Акадэміі Святога Лукі ў Рыме (1860). Вярнуўшыся з Італіі, працаваў у Вільні, быў звязаны з рэвалюцыйнымі коламі, прымыкаў да "чырвоных". У 1863г. ўдзельнічаў у паўстанні на Віленшчыне (атрады К.Карэвы, І.Пасербскага, Л.Нарбута) і ў Коўне. У верасні 1863 года арыштаваны ў Пецярбургу, у студзені 1864 года ўцек з ковенскай турмы за мяжу. Жыў у Лондане і Парыжы, выканаў шмат графічных работ, прысвечаных падзеям 1863 г. У 1866 годзе вярнуўся ў Расію, быў сасланы ў Вятку. З 1871 г. ў Варшаве, ілюстраваў часопіс "Каласы" і "Ілюстраваны штотыднёвік". У 1883 – 86 гг. працаваў у Парыжы. Памер 11 (23) жніўня 1893 г. ў Налэнчове пад Варшавай. У жывапісных і графічных работах адлюстраваў жыццё і побыт беларускага і літоўскага народаў, іх гістарычнае мінулае (графічныя творы "Смерць Кейстута", "Сутычка літвінаў з крыжакамі", "Хрышчэнне язычнікаў", "Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў"). Быў у сяброўскіх адносінах з Ф. Багушэвічам, напісаў яго партрэт.

**Бібліяграфія:**


1.Андрыёлі Міхал Эльвіра // Асветнікі зямлі беларускай: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2004. – С. 23-24.

2. Андрыёлі Міхал Эльвіра // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т.1. – Мінск, 1969. – С. 333. (см. 133).

3. Андрыёлі Міхаіл Эльвіра // Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Т.3. – Мінск, 1989. – С. 224 – 229.

4.Андрыёлі Міхаіл Эльвіра // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раена / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш.; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 99.

5.Андриоли Михал Эльвира // История русского искусства. Т. 9, кн.2. – Москва, 1965.

6. Дробаў, Л.Н., Кісялёў, Г.В. Андрыелі Міхал Эльвіра / Л.Н. Дробаў, Г.В.Кісялеў // Энцыклапедыя гісторыі ларусі. У 6 т. Т.1. – Мінск, 1993. – С. 119-120.

7.Дробаў, Л.Н., Кісялёў, Г.В. Андрыёлі Міхал Эльвіра / Л.Н. Дробаў, Г.В.Кісялеў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т.1. – Мінск, 1984. – С. 115-116.

8. Дробов, Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX века / Дробов Л.Н. – Москва, 1974. – С. 161-167.

9. Чарота, І.А. Андрыёлі Міхал Эльвіра / І.А. Чарота // Беларуская энцыклапедыя. У 18т. Т.1. – Мінск, 1996. – С. 357-358.
10. Шніп, В. Беларускі пантэон: балада Міхала Андрыёлі / Віктар Шніп // Наша слова. — 2019. — 13 лістапада (№ 46). — С. 6.
11. Andriolli – swiadekswoichczasow: listyiwspomnienia/ - Wroclawetc., 1976.
12. Piatkowski, N., Dobrzycki, H. AndriolliwsztuceIzyciuspolecznym. – Warszawa, 1904.